# Сумесная дзейнасць выхавальнікаў і бацькоў па развіцці традыцый народнай педагогікі (з выпыту работы).

Маўленчае развіццё дашкольнікаў у нашай краіне адбываецца у спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі руска-беларускага двухмоўя (білінгвізму). Для большасці дзяцей першай мовай, на якой яны вучацца размаўляць і думаць, будуюць зносіны з акружаючымі іх людзьмі, з'яўляецца руская мова, а беларуская выступае для іх як другая. Беларуская мова ўсведамляецца ў грамадстве як родная, на аснове якой адбываецца нацыянальна-культурная сацыялізацыя дзяцей. Дашкольнікі мала чуюць родную мову ў шырокім ужытку, а таму маюць бедны слоўнікавы запас, іх маўленне знаходзіцца пад уплывам рускай мовы.

У сувязі з гэтым, сам час патрабуе звярнуцца да сваіх вытокаў, далучаць дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры, паглыбляць знаёмства з родным краем, беларускімі традыцыямі, фальклорам, прывіваць пачуццё грамадскасці, любоў да Радзімы. Важна, каб дзеці ведалі і шанавалі гісторыю сваіх продкаў, каб з павагай ставіліся да беларускай мовы, не саромеліся на ёй размаўляць. Адказнасць за гэта ляжыць на нас-педагогах і бацьках.

Далучэнне да традыцый народнай педагогікі падразумявае перадачу сацыяльнага вопыту, норм паводзін, грамадскіх традыцый падрастаючаму пакаленню. А аснову народнай педагогікі складаюць: духоўная культура, народныя звычаі, традыцыі. Дашкольная адукацыя у Рэспубліцы Беларусь забяспечвае станаўленне самасвядомасці дзіцяці на аснове пазнання гісторыі і культуры свету, свайго народа, найбліжэйшага сацыяльнага асяроддзя.

Пры планаванні арганізаванай работы з бацькамі, з мэтай выяўлення ступені інфармаванасці аб народных святах і абрадах, гатоўнасці да удзелу ў іх арганізацыі, я спачатку выкарыстоўваю анкетаванне, у якім бацькі адказваюць на пытанні па веданню традыцый народнай педагогікі: святаў, гульняў, звычаяў. На аснове адказаў плануецца тое ці іншае свята, забава.

Народныя святы маюць асаблівую ролю ў далучэнні дзіцяці да народнай культуры, з'яўляюцца яркай формай адпачынку дарослых (педагогаў і бацькоў) і дзяцей, аб'яднаных супольнымі дзеяннямі і агульнымі перажываннямі. Напярэданні іх правядзення ажыццяўляецца вялікая работа: дзецям раскрываецца сэнс свята, яны вучаць вершы, песні, карагоды, разам з бацькамі і выхавальнікам рыхтуюць адпаведныя атрыбуты, касцюмы. Супрацоўніцтва паміж дзецьмі і бацькамі на народных святах і забавах аказвае вялікі станоўчы уплыў. Сумесна з бацькамі праводжу беларускія народныя забавы: "Калядкі", "Гуканне вясны" або "Масленіца", "Купалле".

З вопыту работы неабходна зазначыць, што ў сумеснай дзейнасці педагогаў, дзяцей і іх бацькоў ствараецца станоўчы эмацыянальны настрой творчасці, наладжваюцца сяброўскія узаемаадносіны, паляпшаюцца сямейныя адносіны бацькоў і дзяцей. Бацькі лепш пазнаюць сваіх дзяцей, а педагогі-бацькоў. Бацькі атрымліваюць магчымасць цікава праводзіць вольны час разам са сваімі дзецьмі, навучаюцца навыкам зносін з іншымі дзецьмі і бацькамі. На забавах і святах дзеці знаёмяцца з асаблівасцямі жыцця беларускага народа ў мінулым. Каб зацікавіць дзяцей забавай, я імкнуся ствараць радасную атмасферу, стараюся, каб у дзяцей паўсталі яркія ўраджанні, звязаныя са святам. Свята, ў якім удзельнічаюць дарослыя і дзеці, пакідае глыбокі след у дзіцячай душы і умацоўвае добрыя пачуцці.

Пры арганізацыі беларускіх народных забаў абавязкова кіруюся прынцыпамі народнай педагогікі, перш за ўсё ўлічваю магчымасці дзяцей успрымаць прапанаваныя святы, рухаемся з імі ад простага да больш складанага. Напярэдадні вывучаюцца вершы, загадкі, гульні, чытаюцца апавяданні пра тое ці іншае свята, расказваецца, што яно абазначае, калі яго святкуюць.

На жаль, не ўсе бацькі (асабліва маладыя) станоўча адносяцца да падрыхтоўкі і ўдзелу ў народных святах і абрадах. Менавіта таму прыходзіцца шукаць сродкі актывізацыі ў гэтым накірунку, далікатна тлумачыць аб значэнні ўдзелу бацькоў у арганізацыі і правядзенні такіх мерапрыемстваў. Гэта адбываецца часцей за ўсё ў працэсе індывідуальных гутарак, кансультацый, рэкамендацый, віктарын, дзе бацькі знаёмяцца з псіхолага-педагагічнымі асновамі засваення дашкольнікамі роднай мовы, са зместам праграмы развіцця беларускага маўлення дзяцей, атрымліваюць даступныя метадычныя матэрыялы для развіцця беларускага маўлення ў сям'і. Хочацца зазначыць, што прыходзіцца звяртацца за дапамогай у правядзенні народных свят і забаў да больш сталага пакалення – бабуль выхаванцаў. Вось менавіта яны заўсёды з задавальненнем адгукаюцца на такія прапановы і прымаюць актыўны ўдзел у такіх мерапрыемствах. Яна дапамагаюць у арганізацыі гульняў, падрыхтоўцы касцюмаў, гатуць беларускія стравы і, тым самым, заахвочваюць маладое пакаленне да ўдзелу.

Акрамя гэтага, у нашай дашкольнай установе штотыднёва ў чацвер праходзяць беларускамоўныя дні. У гэтыя дні прывабліваем бацькоў размаўляць толькі на роднай мове, паказваючы тым самым прыклад сваім дзецям. У кутку для бацькоў размяшчаем змест мастацкіх твораў, з якімі пазнаёміліся на працягу дня, а бацькі па жаданню паўтараюць іх дома.

Такім чынам, толькі ад сумесных намаганняў педагогаў і бацькоў, іх цеснага супрацоўніцтва, залежыць якасць фарміравання беларускага

маўлення дзяцей, а затым і якасны ўдзел у святах, ранішніках, забавах. Дарослыя павінны самі любіць мову і размаўляць на ёй. Нельга вывучыць родную мову пад прымусам, яна павінна ўвайсці ў сэрца і думкі дзяцей непрыкметна, лёгка. Неабходна выхоўваць дзяцей добрымі, дапытлівымі, ўважлівымі да ўсяго. І адначасова абуджаць веру ў тое, што яны вырастуць патрэбнымі на нашай зямлі людзьмі.